EUROVISION SONG CONTEST STOCKHOLM 2016

# МУЗЫЧНЫ КАКТЭЙЛЬ ПРАЗ ПАЛІТЫЧНУЮ САЛОМКУ

**У ноч з мінулай суботы на нядзелю інтрыга вакол еўравізійнага алімпа перастала існаваць. На тытул пераможцы 61-га «Еўрабачання» і прызавы хрустальны мікрафон прэтэндавалі канкурсанты з 26 краін. Тыя заўзятары, хто паставіў на Украіну, выйгралі з каэфіцыентам прыкладна 9 да 1 — менавіта такія прагнозы рабілі вядучыя букмекерскія канторы наконт трыумфу спявачкі Джамалы (па-за сцэнай — Сусаны Джамаладзінавай). У выніку прадстаўніца Украіны па суме галасоў нацыянальных журы і гледачоў набрала 534 балы і абышла галоўных канкурэнтаў з Аўстраліі (511 балаў) і Расіі (491 бал).**


У першыя хвіліны пасля абвяшчэння Джамалы пераможцай «Еўрабачання-2016» эмоцыі ў стакгольмскай «Глобен-Арэне» білі цераз край.

Фота www.eurovision.tv.

Думаецца, пасля шоу мала хто застаўся ў палоне стэрэатыпа, быццам «Еўрабачанне» цікавіць найперш публіку нетрадыцыйнай арыентацыі. Мяркуючы па ходзе галасавання, самыя актыўныя ягоныя гледачы сёлета... вымушаныя мігранты? Альбо высокім ацэнкам паспрыяў скандальны арэол песні «1944», якую Джамала напісала паводле ўспамінаў сваёй прабабулі і прысвяціла дэпартацыі крымскіх татар (меркавалася нават, што песню могуць дыскваліфікаваць за палітычныя матывах, аднак не, арганізатары кампазіцыю прапусцілі без цэнзуры). Альбо Еўропу зачапіў уласна творчы складнік нумара — музыка, выканальніцкае майстэрства артысткі, нацыянальны каларыт... Ці такім чынам прадстаўнікі розных краін не столькі падтрымалі аднаго ўдзельніка, колькі выступілі супраць іншых лідараў. Альбо ўсё гэта разам. Можна доўга агучваць здагадкі і ні разу не ўгадаць — «Еўрабачанне» заўжды адметнае сваёй супярэчлівасцю і непрадказальнасцю. Таму давайце пра ўсё па парадку.

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Нагадаем, сёлета ўпершыню пераможцу конкурсу вызначалі па новай схеме. Галасы прафесійных журы і тэлегледачоў, трансфармаваныя ў балы ад 1 да 12, не сумаваліся ў суадносінах 50/50, а падлічваліся паасобку. Такім чынам у першую пяцёрку паводле версіі нацыянальных журы ўвайшлі (па ўзрастанні) Расія, Мальта, Францыя, Украіна і Аўстралія. Тэлевізійная аўдыторыя з 42 краін-удзельніц расставіла акцэнты крыху інакш, і лідарамі ў гледачоў сталі адпаведна Балгарыя, Аўстралія, Польшча (між іншым, у журы польскі Араміс стаў толькі 25-м!), Украіна і Расія. Як той казаў, адчуйце розніцу. А галочнае, паспрабуйце вось так адразу зразумець, чаму суддзі аддалі «золата» Аўстраліі, гледачы — Расіі, а перамагла Украіна.

Затое гэтая схема падліку галасоў практычна нівеліравала так званы «добрасуседскі прынцып», і сёлета многія краіны не абменьваліся найвышэйшымі ацэнкамі з геаграфічна блізкімі дзяржавамі, а рабілі кожная свой выбар, часам нават нечаканы. Беларусь, зрэшты, на абодвух франтах традыцыйна падтрымала перадусім Расію, кой і наша журы, і гледачы аддалі 12 балаў. Іншыя ацэнкі разышліся. Беларускія суддзі паставілі 10 балаў Літве, 8 — Швецыі, 7 — Украіне, 6 — Аўстраліі, 5 — Мальце, 4 — Бельгіі, 3 — Арменіі, 2 — Азербайджану, 1 — Балгарыі; рэйтынг гледачоў выглядаў інакш: 10 — Украіна, 8 — Азербайджан, 7 — Арменія, 6 — Польшча, 5 — Латвія, 4 — Балгарыя, 3 — Венгрыя, 2 — Швецыя, 1 — Аўстралія.

У любым выпадку, новая схема галасавання пацвердзіла, што мае права на жыццё: па-першае, яна дазволіла скарацыць зацяжную працэдуру абвяшчэння балаў, а па-другое, правяла тоўстую дэмаркацыйную лінію паміж поглядамі афіцыйных экспертаў і простых гледачоў.


Нумар Арменіі — той самы выпадак, калі не важна, пра што песня: дзяўчына магла проста хадзіць па сцэне.

## ДАРЭЧЫ

Кожны ахвотны можа зазірнуць на афіцыйную старонку конкурсу www.eurovision.tv і ўбачыць поўную раскладку галасавання ў абодвух паўфіналах і фінале «Еўрабачання-2016». Са зводнай табліцы відаць, чаму беларус IVAN не трапіў у фінальнае шоу: артыст заняў толькі 12-е месца ў паўфінале з 84 баламі: 52 ад гледачоў і 32 ад журы, у тым ліку 6 ад Аўстраліі і Балгарыі, 5 ад Украіны, 4 ад Польшчы, 3 ад Вялікабрытаніі, 2 ад Германіі, Ірландыі і Славеніі і па 1 ад Латвіі і Швейцарыі.

Хочаце ведаць, хто з беларускіх артыстаў, прадзюсараў і прадстаўнікоў медыясферы ўваходзіў сёлета ў журы? Калі ласка: спявак Тэа, кіраўнік тэлеканала «БелМузТБ» Аляксандр Капёнкін, кампазітар Генадзь Маркевіч, спявачка Вольга Плотнікава і педагог па вакале Вольга Драздова. Паводле правілаў, цяпер кожны з іх зможа ўзяць удзел у нацыянальным журы не раней чым праз 3 гады.

## ЭМОЦЫІ І ЎРАЖАННІ

Цяжка паспрачацца, што ў мелодыі сёлетняга шоу гучалі не толькі музычныя, але і палітычныя ноткі. Адразу некалькі краін выбралі востраактуальныя тэмы для сваіх творчых пасланняў. Грэчаскі гурт «Арго» расказаў пра цяжкасці, з якімі сутыкаюцца бежанцы на шляху да лепшай долі. Боснія і Герцагавіна спалучылі ў выступленні калючы дрот і заклік да любові і даравання, «бо гэта тое, што трэба нашай краіне пасля ўсіх войнаў, якія тут адбываліся». Прыкладна на тую ж тэму, але ў пазітыўным ключы выступіла спявачка з Італіі, чыя песня «імкнецца знішчыць усе геаграфічныя і культурныя адрозненні паміж людзьмі і нарэшце аб'яднацца». Дый, уласна кажучы, у песні-пераможцы конкурсу можна пачуць не толькі цытаты з гісторыі, колькі водгукі сучасных рэалій усіх ваенных канфліктаў...


Міхал Шпак з Польшчы проста выйшаў, проста спеў, проста завабіў сэрцы публікі.

Магчыма, таму шэраг заходніх СМІ з асцярожнасцю каментуе вынікі «Еўрабачання». «Гэты конкурс ніколі не павінен рабіцца палітычнай платформай, — думка музычнага гісторыка Джона Кенэдзі О'Конара, — бо гэта парушае ўстаноўленыя правілы». Старшыня брытанскага фан-клуба ОГАЕ Аластэр Рэндал адзначае: «Рэакцыя на перамогу Украіны неадназначная. Многія заўзятары конкурсу, з аднаго боку, захапляюцца магутным голасам Джамалы, яе энергетыкай і ўражлівымі візуальнымі эфектамі шоу, а з другога, зазначаюць, што пераможцу ёй прынёс выразны палітычны пасыл песні, а не яе музычная якасць».

На гэтым фоне рызыкуюць быць незаўважанымі іншыя трэнды сёлетняга шоу. Адзначым перадусім усё меншую касцюмаванасць (дзе тыя ўборы-трансформеры ўсіх колераў вясёлкі, што радавалі вока гледачоў да крызісу?) і ўсё большую тэхналагічнасць (навошта патрэбны грувасткія дэкарацыі, калі іх можа замяніць LED-экран і камп'ютарныя спецэфекты?). Асабліва вызначыліся ў гэтым сэнсе Расія з яе падарожжам скрозь прорвы да зорак, Аўстралія з ажыўшымі сацыяльнымі сеткамі, Арменія з кіберсексуальнымі копіямі прыгажуні-спявачкі і, не будзем залішне сціплымі, Беларусь з галаграфічным відэа пра ваўкоў і іншых.

У тэхналагічнасці і відовішчнасці недахопу не было, а вось з эмоцыямі, здаецца, ёсць нюанс. У параўнанні з леташнім і ранейшымі шоу кідалася ў вочы практычна поўная адсутнасць фрыкаў. Ні вам індыка з мікрафонам, ні барадатай жанчыны, ні эпатажнай праведніцы з/на зоркай у галаве, ні рокераў у вобразах пачвар... Каго запомняць гледачы на «Еўрабачанні-2016», акрамя 2-3 персанальных улюбёнцаў — хіба малдаўскага астранаўта, дзяўчынку-Мальвінку са Швейцарыі, жывую ляльку-аніме з Германіі? Дык тое не факт. А хто з цяперашніх удзельнікаў выклікаў у вас рогат, абурэнне, шок? Ніхто? Гэта і сумна.

## ПЛАНЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Як бы мы да яго ні ставіліся, але «Еўрабачанне-2016» стала гістарыяй, і дзесьці на гарызонце маячыць наступны конкурс. Калі канкрэтна ён пройдзе, арганізатары вызначаць у найбліжэйшы час. Дзе адбудзецца шоу, вырашае краіна-пераможца, хоць тут ёсць пэўныя складанасці — многія засцерагаюцца ехаць у краіну, дзе дагэтуль захоўваецца надзвычай напружаная палітычная сітуацыя, хоць прадзюсар шоу Ян Ола Санд і запэўніў, што Украіна гарантуе парадак і бяспеку для ўсіх удзельнікаў. Застаецца спадзявацца, што спалучэнне здаровага сэнсу, эканамічнага складніка і творчай зацікаўленасці супольна пераадолеюць усе штучныя перашкоды ў арганізацыі 62-га песеннага конкурсу. Цікава, якім ён будзе? Рабіце вашы стаўкі, спадарства!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.03 | 21.10 | 16.07 |
| Віцебск — | 4.47 | 21.06 | 16.19 |
| Магілёў — | 4.53 | 21.00 | 16.07 |
| Гомель — | 4.57 | 20.49 | 15.52 |
| Гродна — | 5.20 | 21.24 | 16.04 |
| Брэст — | 5.28 | 21.17 | 15.49 |

**Месяц**

*Першая квадра 13.05–21.05. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

*Пр. Ісака, Кірылы, Мікіты.*
*К. Веранікі, Веры, Віктара, Фелікса.*


Фота Алеся КАРНІЕНКІ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 17 МАЯ

**1769** год — нарадзіўся Бенядзікт Барсук, вучоны-медык. Выхадзец з шляхты Мінскай губерні. Пачатковую адукацыю атрымаў у Мінску. Скончыў са ступенню доктара філасофіі фізіка-матэматычны (1799) і са ступенню доктара медыцыны медыцынскі (1806) факультэты Віленскага ўніверсітэта. З 1806 года — прафесар медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта. Падрыхтаваў і вёў першы ў навуковых установах Беларусі курс судовай медыцыны. З 1806 года быў членам Віленскага таварыства лекараў. Памёр у 1808 годзе.

**1886** год — 130 гадоў таму нарадзіўся Стэфан Стэфанавіч Маркоўскі, беларускі музыка, педагог. Вучыўся ў Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі, у 1937 г. скончыў Беларускую кансерваторыю. Заснавальнік школы ігры на ўдарных інструментах у Беларусі. З 1932-га выкладаў у Беларускай кансерваторыі і Мінскім музычным вучылішчы. Адыграў значную ролю ў аднаўленні Беларускай кансерваторыі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар «Школы ігры на ўдарных інструментах». Памёр у 1949 годзе.

**1900** год — нарадзіўся Нікіфар Якаўлевіч Наталевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі.



У 1919-1937 гадах — у Чырвонай Арміі: палітрук роты, камісар палка, начальнік палітаддзела дывізіі. З лістапада 1937-га да ліпеня 1938-га — в. а. старшыні ЦВК БССР. У 1938-1947 гадах — старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. У 1950-1960 гадах быў на гаспадарчай рабоце ў Мінску, Баранавічах, Брэсце. Памёр у 1964 годзе.

## Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік:**

*«Горычы на свеце многа, але і ў самай большай пасудзіне ёсць дно, няхай сабе яна і да краёў наліта атрутай».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1967.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 мая 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12